

ДЗМІТРЫ ШАТЫЛОВІЧ

**ДЗМІТРЫ ШАТЫЛОВІЧ**

# МАЁ ПАДЛЯШША

KAMUNIKAT.org

Выдавецтва ГП БГКТ
Беласток 1993

**Рэдактар**

Віктар Швед

KAMUNIKAT.org

Wydawca
Zarząd Główny
**Białoruskiego Towarzystwa Społeczno Kulturalnego**
**w Białymstoku**

**Skład: PUBLIKATOR, Białystok, ul Branickiego 9**

**Druk: ORTHDRUK, Białystok, ul. Antoniuk Fabryczny 13**

АДГЭТУЛЬ МЫ РОДАМ

На пачатку 1992 года паявіўся першы паэтычны зборнік Дзмітрыя Шатыловіча „Эцюды падарожжа", зместам якога з'яўляецца багаты цыкл вершаў навеяных уражаннямі і роздумамі паэта з пабывак у гістарычных мясцінах за мяжой. Асноўны аднак напрамак паэтычнай твор-часці Шатыловіча гэта патрыятычная, прыродаапісальная і любоўная лірыка, узнікшая на аснове трывалых успамінаў з гадоў мала-досці, якія працякалі ў роднай беларускай вёсцы Чаромха на Беласточчыне. Інжынер па прафесіі, выконваючы адказную працу ў праектнай арганізацыі Міністэрства энергетыкі ў Варшаве, час сваіх водпускаў прысвячаў абавязкам экскурсавода выязджаючых за мяжу груп турыстаў, а таксама абцяжараны сямейнамі клопатамі не мог многа часу прысвяціць літаратурнай дзей-насці. Трэба аднак сцвердзіць, што вершы паэта, друкаваныя на старонках „Нівы" і ў кніжных выданнях БГКТ, начынаючы ад 1957 года, маюць несумненную літаратурную вартасць і ўвайшлі ў агульную скарбніцу здабыткаў Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа" ў Польшчы. На Беласточ-чыне да сёння чытачы „Нівы" памятаюць змешчаныя яшчэ ў пяцідзесятых гадах такія вершы Шатыловіча як „Падляшша", „Ты ўжо забыла", „Радзіма" і многія іншыя. У сваіх патрыятычнага характару вершах паэт са скрупулёзнай дакладнасцю прад-

ставіў складанае становішча беларускіх сялян у даваеннай Польшчы і сумны лёс іх басаногіх дзяцей. Ды яшчэ і ў пасляваенны перыяд краявіды Падляшша захавалі сваё даўняе аблічча. Хочацца тут прыгадаць урывак першага надрукаванага ў „Ніве" верша:

*Ізноў Падляшша. У акне вагона*
*Мільгаюць манатонна сумныя палі,*
*Загоны вузкія бягуць пад лес зялёны,*
*Дзе стужкай аддзяліў ён неба ад зямлі.*
*Ды згінуў грозны лес і мігам перад намі*
*Адкрыўся вузкі луг з мізэрнаю травой,*
*Пасуцца два кані з збцёртымі бакамі*
*І моцна спіць пастух з вуздой пад галавой.*
*Шмыгнуў за сонным гаем хутар незнаёмы*
*І зажаўцеў за пуняй садзік малады,*
*І хаткі шэрыя пакрытыя саломай*
*Вітаюць нас здалёк, як вулляў два рады.*
*З айчыннаю зямлёй я зжыўся ад калыскі,*
*І пакахаў яе тут сэрцам і душой.*
*І гэты родны край заўжды мне будзе блізкі,*
*Хоць можа сумны ён, ды ўсё ж такі ён мой.*

(„Падляшша")

Выклікаюць таксама зацікаўленне змешчаныя ў зборніку вершы аб прыгажосці роднага краю і любоўная лірыка. Варта прыгадаць, што паэзія Шатыловіча аднолькава ўспрымаецца і з'яўляецца блізкай сэрдцу так выхадцам з нашых бела-рускіх сёл, як і мясцоваму вясковаму насельніцтву, з якога паэт выводзіць сваю радаслоўную і якому прысвячае вершы.

**Вікгар Швед**

# ПАДЛЯШША

Ізноў Падляшша.У акне вагона
Мільгаюць манатонна сумныя палі,
Загоны вузкія бягуць пад лес зялёны,
Дзе стужкай аддзяліў ён неба ад зямлі

І межы, межы, без канца і краю,
Абселі ўвесь раўнінны акіян!
Спакойна стала тут, бо восень наступае,
Бязлюдна на палях і пуста,дзе ні глянь.

А вось і лес – астанкі старой пушчы –
Загарадзіў акно смарагдавай сцяной,
Мясцамі страшны ён, здаецца ў гэтай гушчы
Ніколі чалавек не стаў сваёй нагой.

Галіны дрэў раптоўна пацямнелі,
З хвілінай кожнаю відаць усё слабей:
Як быццам наш цягнік ускочыў да тунеля
І дзесь ляціць уніз усё глыбей, глыбей...

Ды згінуў грозны лес і мігам перад намі
Адкрыўся вузкі луг з мізэрнаю травой,
Пасуцца два кані з абцёртымі бакамі
І моцна спіць пастух з вуздой пад галавой.

Шмыгнуў за сонным гаем хутар незнаёмы
І зажаўцеў за пуняй садзік малады,
І хаткі шэрыя пакрытыя саломай
Вітаюць нас здалёк, як вулляў два рады.

Высокі з крыжам купал над царквою сіняй
У светлых хвалях сонца золатам блішчыць.
 А побач за сялом між вольхай і альшынай
Малая рэчка ў ценю дрэмле альбо спіць.

Мільгнулі з-за кустоў дзіцячыя прычоскі,
Бяжыць да хат сваіх вясёлая гурма,
Вяртаюцца са школы, дзесь з суседняй вёскі,
Бо ёсць царква ў сяле, а школы дык няма.

Але заскрыгатала раптам пад вагонам,
І гучна загудзеў здалёку паравоз,
І станцыя барак – за вузенькім пероном –
Спаткала, як заўжды, на клумбай дзікіх руж.

І прывітала нас тут меладычнай мовай,
Прыемным цёплым тэмбрам хваля галасоў,
Якія загучалі ў цягніку сталёвым
Сімфоніяй цудоўнай беларускіх слоў.

З айчыннаю зямлёй я зжыўся ад калыскі,
І пакахаў яе тут сэрцам і душой,
І гэты родны край заўжды мне будзе блізкі,
Хоць можа сумны ён, ды ўсё ж такі ён мой.

*1957 г.*

## СЛАНЕЧНІК

Вось сонца ўзглянула з-за воблака меднага
Скрывілася нібы ад болю
І слёзамі — каплямі дожджыку бледнага
Абмыла сланечнік у полі.

І гэты сланечнік заморгаў калёрамі —
Ён стаў прыгажэйшы ад ружы —
Зайграў непаўторнымі свету узорамі
Чароўных алмазаў-жамчужын.

Дрыжаць аганькі залацістымі роямі,
Як рунь феерверкаў у свята,
Мажліва яны выражаюць тут мроямі
Адважную гібель салдата.

Падпоўз ён калісьці пад грозны танк ворага
І кінуўшы звязку гранатаў,
Не мог уцячы — заплаціў вельмі дорага,
Ён згінуў ад куль супастатаў.

І тут, дзе сланечнік іскрыцца пад горкаю,
Ляжаў ён за танкам разбітым,
Закрыў твар пілоткай з чырвонаю зоркаю,
Крывёю, як пенай, заліты.

Астанкі да зборнай магілы даставілі,
Зарылі ў глыбокую яму.
Па ім на іржэўніку толькі аставілі
Бруснічна-пунсовыя плямы.

І доўга навокал сляды акалічныя
З сталёвай пачварай гарбатай,
Расказвалі моўчкі пра смерць гераічную,
Пра подзвіг апошні салдата.

Мо ветры крывінкі з крышталкамі чыстымі
Дажджу веснавога змяшалі
І вось на сланечніку зноў залацістымі
Агнямі яны заігралі.

Яны мігацяць залацістымі роямі,
Як зоркі ў нядбалай сваболі...
Як факел жывы над грабніцай з героямі
Сланечнік красуецца ў полі.

***1957 г.***



KAMUNIKAT.org

## ЛЕПШ Я ХАЦЕЎ БЫ

Ужо лепш я хацеў бы ў гнілых лахманах,
Як бяздомны бадзяга, блукаць век без мэты,
Ці хваробай зняволены, ці ў кайданах
На турэмнай пасцелі пражыць свае леты.
Ужо лепш я хацеў бы пайсці жабраваць,
Ад сяла да сяла з торбай лазіць праз поле,
І ад голаду-холаду плакаць, стагнаць,
І не бачыць надзеі на лепшую долю;
Ужо лепш я хацеў бы нырнуць дзесь пад лёд -
Утапіцца, ці куляй пакончыць з сабою –
Чым заплямiць айчыну і родны народ
Злом і брудам ілжы - для багацця, спакою.

*1957 г.*

KAMUNIKAT.org

* * *

Я рос у калысцы з палёў і лугоў,
Ахружавай плахтаю лесу.
Вясною між кветак, зімой між снягоў,
Пад дахам - блакітам нябесным.

Я першыя крокі ступіў у сяле,
Пазнаў там што сіла, што слабасць.
Вучыўся ў жыцці сам, як трэба смялей
На змену піць горыч і радасць.

Пазнаў там я цяжкую працу сялян,
Капрызны іх лёс, як пагода,
Іх мары, імкненні і шрамы іх ран,
І добрыя дні і нягоды.

Іх лёс для мяне будзе заўжды, як свой,
Калі ён нядобры — сумую,
Калі ён пагладзіць іх цёплай рукой,
Тады і я радасць пачую.

І я бы хацеў, каб на нашых палях
Цвілі вечна кветкі і вольнасць,
І долі шчаслівай хачу для сялян,
Каб цешыцца з імі супольна.

*1960 г.*

## ЧАРОМХА Ў МІНУЛЫМ

Не слаўлю дрэва з араматам
У кветках белых, нібы пух,
А толькі дзве шарэнгі хатак,
Якім адзелі з прызб кажух.

Яны стаялі, як харомы,
У сукнях з каляровых сцен,
З-пад шапак вытканых з саломы
Глядзелі скромна: на пляцень,

На брук каменны, на канавы,
На агароды і сады,
На рад таполяў кучаравых,
На пералесак малады.

На свірны, пуні ля дарогі,
На частаколы і хлявы,
На гнёзды буслаў даўганогіх,
На студні і на журавы.

На ўсё, што мела тады вёска,
Якую бачу сёння ў снах,
Дзе саламяная прычоска
Ляжала ўсюды на дамах.

Дзе ў сценах хат замест падлогі
Чарнеў не раз гліняны ток,
Дзе ложкам быў сяннік убогі,
На рускай печы быў бярлог.

Дзе свет лучыны пад камінам
Хоць рэдка, госцем быў не раз,
А лямпа з кнотам, з керасінам
Свяціла ў хатах доўгі час.

Такая ты была, Чаромха,
Такую помню я цябе,
Пакуль тайфун не зняў пастронкаў
і не пагнаў мой карабель...

Там першы крык маёй уцехі
Прабіўся з-пад страхі як звон, Тады
пачуць яго, як рэха,
Мог у сузор'і Скарпіён.

Я там вучыўся першых крокаў,
Пачуццяў першых, першых слоў,
Пяшчот кахання ў шатры змроку,
Любві да ніў, садоў, лясоў.

Я там вучыўся роднай мовы,
Пазнаў там першага сябра,
Там з першых літар каляровых
Чытаў склады я з буквара.

Калыска - там — майго юнацтва
У кветках радужных лугоў,
Крыніца - першага мастацтва,
Дзіцячых мар і дзіўных сноў.

Там басаног я па далінах
Шукаў загінуўшых кароў,
Там з лесу я насіў маліны,
Карзіны поўныя грыбоў.

Там вынёс я ў часы спякоты
Стог сена з глеістай вады,
Там лодкай аплываў Балота,
З сябрамі бегаў у сады.

Там на кані я віхрам гнаўся,
Як з кветкай, з грываю ў руках,
Там па канавах я катаўся
На з дроту зробленых каньках.

Там ранкам я касіў караты,
Якія вешала раса,
Я цэпам выбіваў дукаты
З калоссяў жыта ці аўса.

У фэст жа, як малы патрыцый,
Адзеты ў светлую парчу,
Трымаў я ў згорбленай капліцы
Цяжкі падсвечнік і свячу.

Там я насіў канфедэратку,
Гарцэрскі галынтук і касцюм,
Там я хадзіў спяваць калядкі
Пад вокны хат, без нот, без струн.

Там я пачуў гром першай буры
І выбух бомб, і піск свінца,
Гразу ваеннай партытуры,
Змяніўшай бег майго жыцця.

Пазнаў там горкі смак нядолі,
І боль варожых кайданоў,
Адтуль папаў я ў змрок няволі
За гранню родных берагоў

Калі ж вярнуўся я ў шынелю
З салдацкай торбаю ў руках,
З даўнейшай вёскі ацалелі
Мой успамін і мроі ў снах.

Агністы змей ваеннай хмары
У попел вёску ўсю змяніў,
Страшэнны жах пасля пажару
Маё юнацтва спапяліў.

***1976 г.***



KAMUNIKAT.org

## ЧЫРЫМУХА*

О, як цешыўся я, што я бацьку послухаў,
І патопаў за ім не шкадуючы сіл,
І здалёк аглядаў сілуэт Чырымухі
Над якім вадакачка бялела, як шпіль.

Я ішоў з ім туды, дзе жылі паравозы,
Дзе са сківіц іх дзьмуў, нібы з пекла агонь,
Дзе па рэйках няслі бегуны-віртуозы
Караванам калёс за вагонам вагон.

Я прыходзіў тады на вакзал з хваляваннем,
Цягнікі прыязджалі, як госці на фэст,
Адпачылі чуць-чуць па кароткім спатканні
І пабеглі ў Варшаву, і ў Вільню, і ў Брэст.

Спатыкаў іх вакзал, як палац беласнежны,
І праводзіў дзесяткамі радужных шыб,
У якіх адбіваўся від неба бязмежны
І зліваўся ў чароўны і радасны німб.

На вакзал я ішоў, як у зал для банкета,
Ззялі сцены яго, як дамаскі булат,
Там купляў і чытаў разам з бацькам газеты,
І цукеркі мне там прадаваў аўтамат.

---

♦ ***мясцовая назва Чаромхі-станцыі***

Чырымуха вясной зелянела наўкола,
За дамамі цвілі і сады і палі,
Там бялелі здалёк, ях абрус, сцены школы,
У якой тры гады мне як сон адплылі.

Я быў сведкам жывым, як у дні завірухі,
Чарады каршуноў прылятали, як гром,
І плявалі з-пад хмар на красу Чырымухі,
І мяцеліцай куль, і гірляндамі бомб.

Я ў слязах аглядаў, як кружылі над ёю,
Як з валля выкідалі смяротны баласт,
Як густы чорны дым запалаўшы крывёю
Замяніў краявід у бліскучы атлас.

Вельмі цяжка было аглядаць яе раны:
І варонкі ад бомб, і шкілеты ад глыб,
Поўразбураны быў за разбітым парканам
Мой знаёмы вакзал без дзвярэй і без шыб.

Хоць палова яго ўжо ляжала ў руінах,
Хоць па залах астаўшыхся вецер гуляў,
Ён стаяў, як салдат, з непакорнаю мінай
І з пагардай на ворага ўверх спаглядаў.

А пасля зноў аджыў, як раней быў вясёлы,
Як калісь ён сачыў кожны рух цягніка,
Ён праводзіў мяне, калі ехаў я ў школу
І са школы мяне кожны раз спатыкаў.

Чырымуха ізноў зацвіла, нібы кветнік,
Вырасталі дамы на руінах, пясках,
Паравозы саплі і звінелі зноў песні
І бурліла жыццё, як па скалах рака.

А далей зноў вайна, зноў снарады і бомбы,
Чырымуха ізноў запалала агнём.
Ды пасля трох гадоў чорных дзён гекатомбы
Замянілася ўсё ў кучу друзу і лом.

І калі я прыйшоў з лабірынтаў блукання,
Дзе ганялі мяне бізуны і тапор,
Зноў да вёскі сваёй, як калісь на спатканні
Не віталі мяне ні вакзал, ні дэпо.

Вадакачка тады не бялела высока,
Там дзе школа была ўжо трава парасла,
І загінуў касцёл, як шацёр адзінокі,
І другая дарога вяла да сяла.

І да гэтай пары не залечаны раны —
Хоць ачысцілі друз, лом змянілі ў метал,
Хоць танцуе тут рой цягнікоў пастаянна -
Запляснелы барак замяшчае вакзал.

*1977 г.*

KAMUNIKAT.org

## РАДЗІМА

Дзе б я не быў, заўсёды я з табою,
І для цябе заўжды мне сэрца б'е,
І кожнай ноччу льюцца, як ракою,
Сны аб табе, ды толькі аб табе.

Я бачу ў снах бязмежныя раўніны
Тваіх палёў і радугу лугоў,
І бурыя тарфяныя нізіны
З гуртом авец і чарадой кароў.

На тых раўнІнах вёскі і пасёлкі,
Дзесь блізка лесу, рэчак ці крыяніц,
І стрэхі шэрыя, і часта, як асколкі,
Блішчыць у сонцы чырвань чарапіц.

Іх сцены хат, здаецца, павуцінай
Па грознай буры сонца апляло,
А з іх акон, як мора, як лавіна,
Ноч заліла ставокае святло.

Дарогі пацямнелі між загонаў
І зашумелі сотнямі машын,
А на палях агромныя „Бізоны"
Збіраюць збожжа ў дзіўныя каўшы.

Я заўжды чую шэпт тваіх таполяў
І гоман пушч, і ціхі шум лясоў,
І скрып калыскі з песняю нядолі,
І смех, і плач дзіцячых галасоў.

Хоць не зазнаў я шчасця ў роднай хаце,
І лёс мяне кідаў у чужышу,
Кахаю я цябе, Радзіма-маці,
Мой кут дзіцячы і маю радню.

Я за цябе ў дні чорныя нягоды
Вінтоўку ўзяў, каб ворагаў страляць.
За гонар твой і за тваю свабоду
Гатоў цяпер я кроў сваю аддаць...

Кахаю я красу тваю, Айчына,
Гук роднай мовы ўсіх тваіх сыноў,
І так хачу каб ты, мая Радзіма,
Не знала больш ні пут, ні кайданоў.

Хачу каб ты расла, жыла багата,
Каб вольную цябе пабачыў свет,
Каб ты цвіла ў будзённы дзень і свята
І каб прапаў апошніх лапцяў след.

Твой лёс, як мой, мне дарагі бясконца,
Калі нядобры - сэрца плач гняце.
Калі ж табе заззяе шчасця сонца
Тады ў душы мне радасць зацвіце.

***1963 г.***

## МАЯ ПЕРШАЯ ХАТА

Не знаў я ў дзяцінстве палацаў,
Не чуў як жылі каралі,
Я вёску сваю толькі бачыў,
На беднай падляшскай зямлі.

Жывуць ва мне толькі ўспаміны
Аб хаце, як вулей малой,
Як фарбы старыя карціны,
Пакрытыя белай імглой.

Я помню счарнелыя сцены
Пад жоўтай страхою, як воск,
Парог ля дзвярей, як палена,
плот з крапівою ў мой рост.

Высокую фортку ля плота,
І прызбу ля самай сцяны,
Штыкеты на шэрых варотах,
Як сотні зубоў з бараны.

І сенцы, і нізкі пакоік,
І белую рускую печ,
Пад цёмнай іконаю столік,
Лампаду, падстаўку для свеч.

Пры сценах дзве бурыя лавы
Насупраць у печы агонь:
Пліта з чыгунамі са стравай
Купалася ў промнях яго.

Маленькія вокнышчыліны
Свяцілі, як зоркі з двара,
Падлогай быў чорны ток з гліны
Патрэсканы, быццам кара.

Між печкай, а сценкай быў „запык" –
Шэсць дошак, з саломы сяннік –
Тады я не бачыў канапы,
Аб ложку я нават не сніў.

Там спаў я ў калысцы дзіцячай,
З яе стаў выходзіць у свет,
Там скончыў хадзіць на карачках
І мовы разгадваў сакрэт.

Не помню хвілін развітання,
Не знаю ці плакаў тады,
Ды помню, што я пастаянна
Хадзіў пасля ў госці туды.

Пазней да палацаў багатых
Закідваў мяне лёсу шлях,
Аднак тая першая хата
Жыць будзе і ў марах, і ў снах.

*1977 г.*



KAMUNIKAT.org

# СУСТРЭЧА

Па каляінах звілістых і слізкіх
Пасля пургі астатніх санак след.
Іду між хат знаёмых мне і блізкіх,
Дзе ад калыскі я глядзеў на свет.

Што крок ступлю, дык чую прывітанне
Знаёмых стрэх, таполяў, жураўлёў.
Яны як родныя, ўсе выйшлІ на спатканне,
Стаяць, маўчаць, бо не хапае слоў.

Аднак штогод дык менш знаёмых бачу,
Дзесь адыйшлі даць месца для другіх,
А сэрца кроіцца ад болю і ад плачу,
Як па сябрах і сваяках сваіх.

Вось пень адзін астаўся ўжо ад вяза,
Які вякі два пережыў падзей,
Які ў дупле шаптаў мне многа казак
І варажыў, як добры чарадзей.

Яшчэ вясной са мной ён прывітаўся,
Яшчэ махнуў чупрынаю галін –
І вось па ім адзіны пень астаўся,
І мой сардэчны ласкавы ўспамін.

Дзе журавель, мой сябар аднаногі,
Што дзюбаю мне воду наліваў?
Засыпалі ўжо студюо ля дарогі,
Якую ён так верна пільнаваў.

Даўно няма маленькай кволай хаткі,
Дзе першы раз я ўбачыў водбліск дня
І дзе пачуў я пацалунак маткі —
Цяпло яе любоўнага агню.

Пажар вайны забраў другую хату,
Дзе я сустрэўся з роднаю сястрой,
І дзе прайшло дзяцінства, нібы свята,
Як смех забаў з вясёлай дзетварой.

Я там вучыўся ў школе пачатковай
Сакрэтаў новай азбукі жыцця,
Пры дапамозе знакаў роднай мовы,
Пры дапамозе зроку і чуцця.

Як мала асталося стрэх з саломы...
Што крок ступлю, дык бачу новы дом.
Для іх я - падарожнік незнаёмы,
Які прайшоў па вуліцы пяшком.

Відаць у іх юнацкую пагарду
Да хат пакрытых мохам даўніны,
Смяюцца зверху вокнамі мансардаў
Пад пухам свежым снежнай белізны.

А там вітае белаю папахай
Мой трэці дом, старэйшы ў тым сяле,
Ён пад сваім старым вясёлым дахам,
Як кветку, гадаваў мяне ў цяпле.

Ён перажыў маё з ім расставанне,
Калі мяне ў няволю вораг браў,
І маткі і сястры маёй рыданне,
Калі ад ран мой бацька паміраў.

Ён перажыў вайну і кананады,
Калі навокал бушаваў пажар,
Палала вёска пад агністым градам,
Шугаў з суседніх дахаў іскар жар.

Сустрэўся я ў шынелю і з рукзакам
З пагонамі салдата на плячах,
І ноччу я не ўбачыў ці ён плакаў,
Ці гэта снег ад холаду пішчаў.

Пасля я, як цыган, блудзіў па свеце,
І горад да сябе мяне прыссаў.
Ды часам я, як сёння, выйду з сеці
І прылячу, як ранкамі раса.

Так я цяпер прыйшоў неспадзявана,
Каб зноў спаткаць усіх маіх сяброў
І з імі выпіць тут бакал шампана
За сівізну ўспамінаў і гадоў.

*1970 г.*

KAMUNIKAT.org

## ТЫ ЎЖО ЗАБЫЛА

Ты даўно ўжо забыла, як у светлыя ночы
Мы з табою сядзелі на лаўцы пад вязам,
Як ад спрэчак іскрыліся нашыя вочы,
Як было нам прыемна і радасна разам.

Нас цікавілі там тэатральныя п'есы,
Захапляла нас тэхніка, фільмы і мода,
І навука і спорт і артыкулы ў прэсе,
І мастацтва, і музыка, дождж і пагода.

А найбольш нам паэзія сілы давала.
Ты любіла Міцкевіча, Пушкіна, Гётэ,
І хваліла Байрана. А Янка Купала
Быў любімым тваім беларускім паэтам.

Беларуская кніжка — сябра неразлучны –
На каленях тваіх там заўсёды ляжала,
І раскрыўшы яе, ты мне голасам гучным
Ці паэмы, ці вершы з уздымам чытала.

Ты сцвярджала тады, што ты вырасла з люду,
І што любіш бязмерна народ беларускі,
І што хочаш змагацца, каб жыў ён усюды
Багацейшы штогод, ды культурна, па-людску.

Ты чакала тады з непахісным спакоем
Што калі атрымаеш дыплом педагога
Дык паедзеш вучыць пад сялянскай страхою,
Дзесь у вёсцы, як кажуць, забытаю Богам.

Час мільгнуў, нас раскінуў па розных дарогах,
Лёс мяне скіраваў у другую краіну.
Ты аставіла мроі за школьным парогам
І надоўга дзесь след за табою загінуў.

А цяпер я гляджу, ты зрабіла „кар'еру":
На настаўніцкі хлеб ты рукою махнула,
Спалучыла свой лёс з пажылым афіцэрам,
І яго пад вянец у касцёл зацягнула.

І жывеш з ім цяпер ты ў сярэднім дастатку,
Ты не едзеш штодзённа да працы трамваем,
Бо ты дома глядзіш чысціні і парадку,
І гатовіш абед і пасуду змываеш.

Ад старых ты паспела сяброў адказацца,
Як табе муж прадставіў прыяцеляў новых,
А прад імі ўжо сорамна нават прызнацца,
Што ты знала калісь беларускую мову.

Ты ад кніжак адвыкла, чытаць перастала,
І забыла сваіх беларускіх паэтаў,
Я не знаю ці ўспомніш пра Янку Купалу,
Як ты ўжо раз у месяц чытаеш газету.

А ў нядзелю ці свята з усмешкай вясёлай,
Апрануўшыся ў моднага крою сукенку,
Ты з ахвотай ідзеш пасядзець да касцёла,
Паказацца мужчынам, жанчынам, паненкам.

І ад часу да часу паехаць у госці,
Пахмяліцца віном і пагутарыць крыху
Аб умовах жыцця, аб грахах маладосці,
І дамоў, як паўночнік, вярнуцца паціху.

Так праходзяць тваe дні, нядзелі і ранкі
І не мучыць цябе іх бязглуздая проза.
Ты зрабілася ціхай тыповай мяшчанкай
І ніхто не абудзіць лянівы твой розум.

Ты не любіш турбот, ты баішся змаганняў,
Не хвалююць цябе грамадзянскія справы,
Не чужым для цябе стала слова „каханка",
Бо і муж твой цяпер менш цябе ўжо цікавіць.

Ён патрэбны табе, як машына да грошай,
Як візітны білет у мяшчанскія клубы,
Як карціна, як мэбля, як пара галошаў,
Ці, як лекар, што лечыць і нервы, і зубы.

***1957 г.***



KAMUNIKAT.org

# ПОМНЮ

Я ўсё помню той мост над абрывам ракі,
Павуціну звісаючай ночы,
І ласкавы апошні твой поціск рукі,
І расою пакрытыя вочы.

Памятаю дрыжачы твой шэпт на губах
Аб каханні, аб доўгай разлуцы.
Як ты моцна трымала ў шаўковых руках
Падарунак мой - жменю настурцый.

Як апошні ты раз цалавала мяне,
Як шаптала „бывай" — неахвоча,
І як плаўнай паходкаю, нібы ў чаўне,
Паплыла ў чорнай бездані ночы.

І я помню, што доўга стаяў і глядзеў
Я на вугаль чарнеючай далі...
Пацалунак жа твой на губах мне гарэў,
І як полымя шчокі палалі.

*1957 г.*



KAMUNIKAT.org

# КАБ ТЫ ЯШЧЭ ЎЧОРА ПРЫЙШЛА

Каб ты яшчэ ўчора прыйшла на спатканне
Букет пышных руж я б табе падарыў,
Я нёс да цябе іх з адзіным жаданнем
Каб позірк твой раз хоць бы іх азарыў.

Яны для цябе зацвілі так цудоўна,
Іх колеры ззялі, як зор аганькі,
Яны б яшчэ доўга цвілі, безумоўна,
Каб ты абняла іх далонню рукі.

Каб ты яшчэ ўчора прыйшла на спатканне
Я сэрца сваё для цябе б перадаў,
Яго ў невымерных знямогах чакання
Праз многа гадоў я табе пратрымаў.

Аднак не прыйшла ты, і кветкі завялі,
Пакрыў іх плёнкаю пыл забыцця,
А сэрца ад сораму, болю і жалю
Заціхла ў грудзях пад цяжарам жыцця.

***1961 г.***

KAMUNIKAT.org

## ХВІЛІНА

Настурка пагасае за акном,
Расходзіцца мацейкі арамат...
Твой пацалунак запалаў агнём,
А серца зазвінела, як набат.

Ліяны рук мне шыю аплялі,
Дыханне пахне свежаю вясной,
Дрыжаць на шчоках колеры малін
І грае цела мілай цеплынёй.

І міг - на край раскошы мы сышлі
І ўпалі ў дзіўны непаўторны стан...
Як ручаі прадметы адплылі
У цемру — неабдымны акіян.

Здавалася, што ў прорву пустаты
Мы ўпалі з велізарнай вышыні,
І ў хвалях ночы, ў моры чарнаты,
Як метэор ныраем ў цішыні.

З адным жаданнем мы тады жылі,
Адзіна сэрца ў нас было ў грудзях,
Адзін агонь гарэў нам у крыві,
Адзіна радасць бліскала ў вачах.

Калі пачуцці дасяглі вяршынь,
І расцвілі, як дзіўных руж букет, -
То лёгка, лёгка стала на душы,
Як быццам зноўку мы прыйшлі на свет.

Ад радасці забылі мы тады
Аб розных жахах нашага жыцця,
І пачуццём гарачым маладым
Хацелі быць так разам без канца.

Аж раптам мы пачулі, што ляглі
У цёмнай ночы на пуховым дне...
Калі мы да прытомнасці дайшлі
Яшчэ зусім не змеркнула ў акне.

***1958 г.***

KAMUNIKAT.org

## ХАЦЕЎ БЫ Я

Ці летам, ці вясной
Хацеў бы, як вяслом,
Высока над зямлёй
Павеславаць крылом.

Вышэй, каб сэрца стук
Чуваць было ў глушы,
Дзе не даходзіць гук
Матораў і машын.

І ў дзіўнай цішыні
Праз радужны ларнет,
Як спутнік з вышыні
Глядзець на цэлы свет.

І цешыцца ў душы,
Які прыгожы ён:
Прыгохы ўздоўж і ўшыр,
І з чатырох старон.

Прыгожы светлы гай,
Прыгожы светлы бор
І груд, як каравай,
І неба, як шацёр.

І рунь усіх палёў,
Бязмежная іх даль,
Гушканне караблёў
У пырсках мутных хваль.

Прыгожы вечны снег
На вострых шпілях гор,
І рэк змяіны бег,
І стэпавы прастор.

Як на дыване траў
Квітнее кожны ўзор,
І луг, зарослы стаў,
І бляск жывы азёр.

Прыгожы захад дня
З румянцамі зары,
Калі язык агню
За хмарамі гарыць.

Прыгожы шэры змрок
Паўзучы з цёмных нор,
І залаты пясок
Дрыжачых іскар — зор.

Прыгожы месяц-шар
У бронзавым агні,
Вісячы, як ліхтар,
У чорнай глыбіні.

Прыгожы сонца ўсход
І цэлы, цэлы свет –
Як сад, як агарод,
Як кветкавы букет.

Хацеў бы я арлом
За воблакі ўзляцець,
І веславаць крылом,
І на зямлю глядзець.

*1959 г.*

## ШТО ЧУЕЦЕ, ДРЭВЫ?

Што чуеце дрэвы, калі ўжо дываны
Ляжаць перад вамі з лістоты пажоўклай?
Ці сумна вам стала, што нудны ўжо ранак,
Што летняя песня ўсіх птушак замоўкла?

Ці чорныя судны на воблаках неба
Не страшаць вас ліўнем, мяцеліцай з градам?
Ці вы адчуваеце нейку патрэбу
Каб раз перажыць і вяселле і радасць?

Што чуеце дрэвы, калі ў дзень пануры
Дзме вецер халодны цьму беленькіх зорак?
Ці цешаць вас снежныя зімнія буры
І пух, што закрыў вам ад холаду корань?

Ці кроплі алмазаў, што моргаюць сонцам
І вас захапляюць і барвай, і бляскам?
Ці неба начное з бліскучым чырвонцам
Таксама вас цешыць, як песня ці казка?

Ніхто вас не цешыць, ніхто вас не страшыць,
Зіму ўсю праспіце, праспіце і восень.
Вам сніцца вясна і нябесная чаша
Залітая сонцам, як поле калоссем.

Жывеце вы ўлетку ў цяпле і дастатку,
Праспіце халодныя дні і нягоды.
Не мучаць вас страсці, людскія парадкі,
Не хочаце ведаць любві і свабоды.

***1960 г.***

## ВЕЧАР НАД РАКОЙ

На люстра ракі,
На ўзгоркі лясоў,
На мох, на пяскі,
На чубы кустоў
Сплываў непрытоены змрок.
Сплываў і гусцеў,
Як кроплі імглы,
Гусцеў і чарнеў,
Як мора смалы,
І гас у зары колер шчок.
Памалу закрыў
Змрок шэрым крылом
Астаткі зары
З ружовым агнём
І цемраю неба заліў.
З усходу плылі
На хвалях густых
Махнатай імглы
Клубы чарнаты
І ноч за сабою няслі.
Яна, як манах,
Сутанай сваёй
Закрыла бляск дня
Над соннай зямлёй
І кінула чорны свой цень.
На цёмнай, як жук,
Заслоне начной
Звіс месяц-павук,

Як дыск, над ракой,
І з зор павуціны пляце.
Заціх шум ялін,
І лес замаўчаў,
Між ціхіх галін
Звер чутка драмаў.
Разбегся птушыны ўвесь хор.
І толькі рака
Бурліва жыла
І ў жоўтых пясках,
Як стужка, плыла
З адбіткамі неба і зор.

II.
У злаках густых
Пры рэчцы ў кустах
Дрыжаць, як лісты,
Два сэрцы ў грудзях
У ціхім экстазе любві.
Злучыла іх тут
Маўчанне зямлі,
І рэчка, і куст,
Пах свежых былін
І пал маладой іх крыві.
Для радасці іх
Патрэбны спакой
І цені глухіх
Начэй над ракой
За лесу зялёнай сцяной.
Іх дом — свет зары
Пад небам сухім,
Іх дах - гушчары
Пасцель іх - імхі,
А грэе каханне адно.
Як радасць вясны,
Як слёз ручаі,

Пазналі яны
Тут целы свае
І вуснаў палаючы смак.
І ў позах нямых
Ляжалі яны,
І ў зрэнках жывых
Гарэлі агні.
А месяц глядзеў на бівак.

*1962 г.*

KAMUNIKAT.org

## ЗНОЎ ПАДЛЯШША

Зноў Падляшша. Край мой родны.
Дзе майго юнацтва годы
Палыхнулі, як паходня
На вячэрніх карагодах.

І даўно іх каляіны
Заняслі пургі Барэя,
Толькі скрыліся ўспаміны
У завулачках падзеяў.

Са шчылін выходзяць ціха
І наводзяць параўнанні:
То мяне засмуцяць крыху,
То пацешаць нечакана.

Сумна мне глядзець, як старасць
Сівізной пакрыла блізкіх,
Напісала на іх тварах
Шмат штрыхоў, барозны, рыскі.

Як яна сваім цяжарам
Ім забрала бляск і сілу,
Ці скавала, як ахвяры,
Злой хваробай ці магілай.

Мне шкада сяброў юнацтва
Тых, якіх я больш не ўбачу,
Бо не можам зноў спаткацца,
Пажадаць здароўя, ўдачы.

Я яшчэ іх памятаю
І вясёлых, і прыгожых
Пры вясельных караваях,
Пры ад'едзе ў падарожжа.

Вельмі цешуся, што бачу
Іх мажных дзяцей і ўнукаў,
Як жывую перадачу
Свежай будучыні ў рукі.

Цешуся, што іх не мучаць
Голад, смага і галеча,
Што іржышча больп балюча
Босых ног ім не калечыць.

Што яны не спяць на дошках,
Што касой травы не косяць,
Што з балота аж да вёскі
Сена мокрага не носяць.

Што не жнуць сярпамі збожжа,
Не малоцяць больш цапамі,
Што не ткуць зімой рагожы,
Не прадуць ільну начамі.

І што ў школу ходзіць моладзь,
Ды здаецца ёй забаўным,
Што бацькі цярпелі голад
І то так яшчэ нядаўна.

Што для іх конь быў багаццем
А карміцелькай — карова,
Што іх маткі ткалі плацця
На аснове каляровай.

Бо хто марыў з іх, каб трактар
Ці машыну мець уласну?
Ездзіць ёю ў горад трактам,
Як на палатне атласным?

Ці хтось думаў з іх, што ў хаце
Будзе мэбля, ці дываны?
І святло. як у палацы,
І вада у кухні з крану?

Памятаю я вяселля:
Без талерак, ежа ў місках,
Пілі госці для пахмелля
Увесь час адным кілішкам.

Пераходзіў з рук у рукі
Той кілішак з горкай водкай,
На дне таза ложкі з буку
Цалаваліся салодка.

То тварог так елі госці,
Як з катла, ды ўсім кагалам,
Агрызалі мяса з косці,
Ды жавалі хлеб і сала.

Як змянілася ўсё гэта
У час скромны пакалення
І культура, і асвета,
І ўсіх поглядаў адценні.

Сумна мне, што ў нашых вёсках
Гіне родны наш абычай,
Рэдка чуць там адгалоскі
З родных назваў, з родных клічак.

З кожным годам песень родных
Усё менш спявае моладзь,
А шукае спевак модных
У замежных балаголаў.

І стыдзіцца роднай мовы,
Калі дойдзе да пасады,
І святкуе ў стылі новым
І вялікдзень, і каляды.

Я люблю далей Падляшша,
Хаты, нівы і бярозы,
І калі з паднебнай чашы
Вее снегам і марозам.

***1970 г.***

KAMUNIKAT.org

## ПАСЛЯ ДАЖДЖУ

Сонца плямамі свеціць
За вэлюмамі хмар.
Вецер дзьме на кларнеце,
Лес пяе, як кабзар.

Над палямі, лясамі,
Птушак чуць пераразвон.
Ён дрыжыць галасамі:
Тэнар, бас, барытон.

Неба кроплямі поту
Напаіла раллю,
Ручаі пазалоты
Залілі ўсю зямлю.

Ззяе луг ізумрудам,
А агатам палі.
А на небе эцюды
Пішуць з хмар караблі.

Стужкі цуднай вясёлкі
Мігацяць агаоньком,
Акружылі пасёлкі
Каляровым вянком.

Сонца выгляне часам
І пакажа свой твар,
Альбо з кіслай грымасай,
Альбо з бровамі з хмар.

І тады зменіць колер
На хвіліну ўвесь свет.
І заззяе на полі
З жоўтых кветак букет.

І здаецца, што неба
Так вітае палі,
Будзіць зернеткі хлеба
У вільготнай зямлі.

***1977 г.***

KAMUNIKAT.org

## УСПАМІНЫ

Мы хаваем ў сябе, як у касе,
Мноства мар, сотні дзіўных ідэй,
Каб з цікавасці выцягнуць з часам
І пазнаць аб іх погляд людзей.

Памяць вяжа ўсе нашы падзеі
Моцнай ніццю ўспамінаў з жыцця,
Частка ззяе, як ветразь на рэі,
Рэшта гіне ў пячорах быцця.

Нас з мінулым злучылі ўспаміны:
Што жадаем, пускаем у свет,
Як не хочам, здымаем з вітрыны,
У тайнік замыкаем сакрэт.

Успаміны радзіліся з думак,
Мыслі іх, як па хвалях, нясуць,
Выбіраюць ім кожны кірунак,
Апранаюць у бляск і красу.

Успаміны нас грэюць, як сонца,
Успаміны нас студзяць, як лёд,
То нам горыч прыносяць бясконца,
То салодзяць жыццё нам, як мёд.

Успаміны нас вучаць і бавяць,
І ствараюць рой ціхіх надзей,
І сумесна стаюцца ўжо нават
Атрыбутам галоўным людзей.

Мы без мрояў, падзей, успамінаў
У пячорах жылі б да сіх пор,
І скакалі б між дрэў па галінах,
І тачылі б каменны тапор.

А на крылах жывых успамінаў
Мы лятаем над пушчай даўнін,
І плывем па пражытых краінах
Між забытых ласоў і раўнін.

Спатыкаем сяброў і знаёмых,
Абдымаем каханых дзяўчат,
Заглядаем да дзіўных харомаў
І да кволых ад старасці хат.

Як прыпомнім мы смерць нашых блізкіх
Нас страхне, як раскацісты гром,
Часта слёзы пальюцца, як пырскі
І запаліцца сэрца агнём.

Але час нам залечвае раны
Эліксірам жыццёвых навін,
Цяжкай працы і будучых планаў
І патынаю нашых маршчын.

І чым больш ёсць у нас успамінаў,
Тым жыццё багацейшае ў нас,
Бо на кожных слядах каляінаў
Большы вопыт дарує нам час.

*1970 г.*

## НОЧ НА ПАШЫ

Ноччу мы на пашы,
Побач лесу луг.
На нябеснай чашы
Поўна светлых смуг.

Месяц скрыўся ціха
За парт'ерай з хмар,
Часам выйдзе крыху,
Блісне, як ліхтар.

І асвеціць: дрэвы,
Сонныя лісты,
Пры лузе пасевы
Са збожжам густым,

Быццам на балконе,
У дупле саву,
Спутаныя коні,
І луг, як канву.

І дзесь пад кустамі
Шэрых пастухоў...
Спяць яны, як камень
І не бачаць сноў.

Змучыліся працай
У будзённы дзень,
Куст ім стаў палацам
А раскошай лень.

Ды вось зноў, як мора,
Ночы чарната
Заліла прастору
кожнага кута.

І не відна стала
Ні кустоў, ні дрэў,
Як бы ўсё папала
У пячоры зеў.

Толькі дзесь у лесе
Вогнішча блішчыць,
Чуць адтуль гук песень,
Смех і піск дзяўчын.

Бавяцца там пары
Шчыра, без маны.
І нам тут не кара,
Хоць ляжым адны.

Чую дотык бюсту,
Твой гарачы твар,
А з салодкіх вуснаў
Пацалункаў жар.

Мне палаюць скроні,
Лашчаць галаву...
А дзесь самі коні
Шчыпаюць траву.

***1970 г.***

## ДАРОГА ДАМОЎ

Схаваўся ў хмарах купал зорны,
Відаць у водблісках зарніц,
Што неба, як кацёл агромны,
Клубамі чорнымі кіпіць.

Заслона тоўстая, як з воўны,
Найшла на цэлы небасхіл,
Плыве стагамі хваль бязмоўных
З запасам поўным свежых сіл.

Закрыла цемра ўсё навокал,
Так што не бачу ўжо кустоў,
Іду ўсляпую вольным крокам
Шашой са станцыі дамоў.

Ды вось заззялі бліскавіцы,
Дрыжыць паветра ад грамоў,
У бліску пазнаю граніцы
Маёй дарогі між палёў.

Падняўся вецер, як шалёны,
І сыпле ў вочы мне пясок,
Гудзе і вые, ў вушы звоніць
Бязлічным хорам галасоў.

Грукочуць громы, вецер свішча,
Ракоча рэха ў бляску стрэл,
Як д'яблы ў пекле дзесь на днішчы
Танцуюць сотні тарантэл.

Гляджу: самотная бяроза —
На паўдарогі да сяла —
Дрыжыць лісьцём, губляе слёзы,
Хоць безліч бур перажыла.

І раптам лівень лінуў з неба
Упаў, як злосны водны вал,
Іскрацца ручаі на глебе,
А ля шашы паўстаў канал.

Вада плыве мне за сарочку
І залівае вочы, рот,
Цячэ мне ў боты, як у бочку,
І б'е фантанам кожны крок.

Ды я бягу па гладзі слiскай,
Не страшны дождж, не страшны гром,
Маланка з фасфаровым бліскам.
Спяшу хутчэй у родны дом.

Вось вёска з водбліскамі вокнаў.
На брук сыходжу я з шашы,
І сам адзін бягу і мокну,
Нідзе не відна ні душы.

Ды паказаўся дом мой родны,
Заве мяне сваім святлом.
Хоць ён стары, хоць ён не модны,
Люблю яго, спяшу ў свой дом.

*1973 г.*

* * *

Сонца золатам праменняў
Разганяе многа ценяў
Між кустоў і дрэў.
Дрэмле лес ва ўласным змроку,
Не чуваць нідзе ні кроку,
Толькі птушак спеў.

Нетры бору страшаць цемрай,
Нібы пашчаю бязмернай
Казачны дракон.
Там, здаецца, ўсё застыла,
А ўсе сосны злая сіла
Узяла ў палон.

І трымае іх без руху,
Напаіўшы ўсіх сівухай,
Каб пачулі сплін.
Ціха там, як у пячоры,
А святло дзесь, як з-за шторы,
Сочыцца з галін.

Пойдзеш ты туды - пачуеш,
Што жыве там і працуе
Кожны пункт зямлі.
Там пад кожнаю былінкай —
Не адна жыцця сцяжынка.
Многа каляін.

*1970 г.*

KAMUNIKAT.org

* * *

*Дабрыле П.*

Каханне часта родзіць горыч,
Прыносіць часам боль і раны.
І не заўсёды свецяць зоры
Над страсці бурным акіянам.

Бывае холад, непагода,
Бываюць ночы, як пячоры.
Бываюць буры і нягоды,
І непатрэбныя дакоры.

Калі ж для нас засвеціць сонца
На бірузой пакрытай чашы,
Заззяюць золатам чырвонцаў
Пачуццяў хвалі ў сэрцах нашых.

Яны сальюцца зноў з сабою,
Шугнуць пажарам, віхрам іскар.
І зноў забуду я з табою
Аб тым, што дзеліць нашу блізкасць.

Пасля зноў збудзімся, як дзеці,
На сочнай поўнай кветак глебе
І скінем з сэрца бруд і смецце,
Каб зноў быць чыстымі, як неба.

І зацвіце букет кахання,
Зайграюць згоднай страсці тоны,
Пакуль не прыдзе час расстання
І не аддзеліць нас заслонай.

*1957 г.*

* * *

Разлукай з табой, як крыжамі Гальгофы,
Пужае мяне немінучасці дэман.
Закончацца нашыя дзіўныя строфы,
Супольны раздзел у жыццёвай паэме.

Вачэй тваіх бляск, як ліхтар у пячоры,
Гарэў увесь час і паказваў дарогу.
З табою мінуў я і ямы і горы,
І слёзныя рэчкі, і смуткаў парогі.

З табою я плыў, як у боскім пароме,
Малое дзіця у абдымках мадонны.
Прыгожы твой твар, міг усмешкі знаёмай
Для сэрца былі, як бальзам цудатворны.

Віно пацалункаў тваіх ап'яняла,
З табой забываў я мінулыя мукі,
Калі чуў на целе тваім, як капэлу,
Гарачага сэрца раскошныя гукі.

Ды час не стаіць, ён бяжыць без затрымкі,
Даходзім мы ўжо да хвілін расставання.
Прыдзецца ісці нам па розных сцяжынках,
Астануцца толькі ўспаміны з кахання.

Я буду чакаць на другую сустрэчу
У путах няволі будзённага быту.
І сніцца мне будзе цудоўны наш вечар
На першым спатканні, на нашых -арбітах.

*1976 г.*

* * *

**С.М.**

Нашто я табе, дарагая?
Навошта гарыш, як агонь?
Ды ты, як вясна маладая,
А мне сівізна гладзіць скронь.

Твой твар, як прыгожая кветка,
Цвіце і чаруе красой.
На мой — цень маршчын кінуў сетку
І рэжа барозны сахой.

Напэўна і я маладзею,
Як грудзі твае абніму,
Якія, як струны Арфея
Дрыжаць у раскошным агню.

Калі з твайго свежага цела
Знікае заслоны вуаль,
Калі на гарачай пасцелі
Скуе нас раскошы каваль.

Напэўна твае пацалункі
Распальваюць страсці любві,
Якія, як газ праз фарсункі
Струменем плывуць да крыві.

Калі ноч закрые маршчыны
І бляск серабра ў валасах,
Пяшчоты і ласкі мужчыны
Мо радуюць больш чым краса.

Як толькі плёнка начная
Адкрые ліхтар угары,
Тады ты зірнеш, дарагая,
І скажаш: які ж ты стары.

***1978 г.***

KAMUNIKAT.org

* * *

Ізноў я ў роднай вёсцы
З сям'ёю, між знаёмых,
Штодзень бываю госцем
На радужных прыёмах.

Усюды запрашаюць
Мяне з адкрытым сэрцам,
І часам адчуваю
Сябе, як на канцэрце.

Далёкія ўспаміны
Спаткання папаўняюць,
Пра нашы каляіны
Да пекла і да раю.

Пра даўнія забавы,
Пра даўнія хваробы,
Пра подзьвігі без славы,
Пра акіяны злобы.

І пра сяброў супольных,
Якіх няма на свеце,
З якімі ў партах школьных
Мы зналіся, як дзеці.

І кожны раз тут маю
Экзамен з роднай мовы,
Якая аджывае
Ва ўсіх маіх размовах.

Якою тут свабодна
Гаворыць люд всяковы...
Не зменіць мовы мода,
Гады не зменяць мовы.

Яе не здрадзяць людзі
У гэтым асяроддзі,
І веру, што жыць будзе
Праз доўгія стагоддзі.

***1978***

KAMUNIKAT.org

# МАТЫЛЬКІ

Перада мной у сочнай пражы поле,
Калышацца, як мора, ураджай.
Рой матылькоў у радужнай сваволі
Знайшоў сябе тут аднадзённы рай.

Вось цешацца, што сонца ярка свеціць,
Што іх ласкае дзіўных кветак чар,
У светлых хвалях бавяцца, як дзеці,
І папіваюць, як віно, нектар.

Іх не цікавіць ці працуюць людзі,
І не баяцца птушак з вышыні.
Не думаюць, што заўтра ўжо не будзе
Нішто іх тут надзеяю маніць.

Яны жывуць тут сённяшняй хвілінай
У радасці праводзячы жыццё.
Пад вечар дождж мо нечакана ліне
І змеціць іх адразу ў небыццё.

***1979 г.***

* * *

Я зноў імкнуся да краіны,
Там дзе юнацтва ўсё правёў,
Дзе ззяюць кветкамі даліны,
Дзе свежы пах дзьме ад лугоў.

Дзе чырванее канюшына
І дзе сваволяць матылькі,
Там дзе пад небам светла-сінім
Ласкаюць вочы васількі.

Здалёк ад шуму гарадскога,
Здалёк ад гоману машын,
Бліжэй да свежага, жывога,
Да лекаў нашае душы.

Там, дзе ёсць чыстае паветра,
Там, дзе гасцінны ёсць народ,
Дзе не даходзяць разам з ветрам
Атрутны попел і смурод.

Дзе лесу шум мне байкі шэпча,
Спявае песні птушак хор,
А паднябесным трэлям пеўчых
Дапамагае рэхам бор.

Там, дзе з раскошаю спаткаю
Маіх знаёмых і сяброў,
Дзе песні даўнія спяваюць
На мове дзедаў і бацькоў.

Там буду мець я перапынак
Ад розных спрэчак і хлусні,
І мець кароткі адпачынак
Ад непрыемнай мітусні.

Імкнуся я да светлай волі,
Да родных ніў і ручаёў,
Дзе я і ў долі і ў нядолі
Калісь юнацтва ўсё правёў.

***1979 г.***

KAMUNIKAT.org

## ФЭСТ

Сёння дзень Ільі прарока,
Сёння ў нашай вёсцы фэст.
Чуць вясёлы рытм навокал
І яго святочны змест.

Чысты кожны панадворак
І прыемна ў сценах хат,
Ва ўсіх клунях і каморах
І парадак ёсць і лад.

Бо сюды прыедуць госці
З навакольных нашых сёл.
Ежу ў поўнай прыгажосці
Ім пакажа кожны стол.

У царкву па ўсіх дарогах
Едуць чарады машын,
А стаіць ужо іх многа
Блізка храма пры шашы.

Па сцяжынах вузкім гужам
Пнецца доўгі пешы строй.
Абмінаюць людзі лужы
З дзяцей мілай чарадой.

Як сапфір сінее неба,
Вогненны на ўсходзе шар
На іржышчах мокрых глебу
Сушыць подыхам, як жар.

На палях няма ўжо жыта,
Нават залаты авёс
Ноччу дожджыкам абмыты,
уе свой апошні лёс.

Толькі лубін роем кветак
Вабіць пчолы ў сіняве,
Нават бульбяны палетак
Стаў маніць, як самацвет.

Лес сасновы ценем змроку
Сочнай зеленню галін
Студзіць жаркія патокі
Залацістых хваль з вяршынь.

Праз букеты з хвойным пахам
Прабіраюся ў глушы
Да царквы з бляшаным дахам,
Што ў сасонніку блішчыць.

Купал скромны з цёмным крыжам
Ледзь віднее ў кучы хвой,
Сцены з дошак пад карнізам
Усміхаюцца разьбой.

Лес крыжоў аброс магілы,
Акружыў пятлёю храм,
А з яго чуць дым кадзілаў,
Пахне ладан, фіміям.

Храм запоўнены народам
Звонкай песняю гучыць,
Побач ходзяць карагодам
Сотні хлопцаў і дзяўчын.

Некалькі ларкоў паблізу
Ахружыла дзетвара.
Крык дзіцячага капрызу
Рэхам б'ецца ў гушчарах.

Як на вычварных парадах
Урачысты ззяе ўздым,
І нясе навокал радасць
І старым і маладым.

Не відаць на тварах злосці,
Вочы свецяць без агню.
Хто сюды з'явіўся ў госці
Будзе прыняты ў радню.

Час вяселля, маладосці
Захапіў мой родны кут.
Пасля будзе баль у вёсцы,
Храмавое свята т

***1980 г.***

KAMUNIKAT.org

# БРАТУ НА ЧУЖЫНЕ

Ураган гістарычных ваенных падзей
Віхрам страху ці пугай няволі
Злосна вырваў цябе з роднай хаты тваёй
І пагнаў, як былінку на полі.
На прытонах чужых, між варожых людзей
Ты блукаў, як бяздомны бадзяга,
Без радні, без сяброў і без добрых надзей,
Без сардэчнага слова адвагі.
А калі гром уціх і дыхнула вясной,
Дзесь пад небам далёкай краіны
Ты прыссаўся хутчэй там да глебы чужой,
Нібы корні пустэльнай расліны.
І, як шчупальцы, парасткі ўглыб запусціў
На чужых непазнаных загонах,
І, як куст крапівы, нечакана зацвіў
На палетках між макаў чырвоных.

Забываеш паволі айчыну, сяброў,
Песні роднай ужо не спяваеш,
Не гаворыш цудноўнаю мовай бацькоў,
Мо саромішся нават, што знаеш.

Мо ў айчыне калісь, як у мачахі злой,
Часам быў ты разуты, галодны,
Але быў у сябе, разам з роднай сям'ёй
Адчуваў сябе вольным, свабодным.

А там, дзе б ні хаваўся, пазнаюць цябе,
Чужаземцам ім будзеш заўсёды.
Да дзяцей там тваіх, як кляймо па табе,
Слова гэта прыліпне ад роду.

Як сцябло пустазелля, між злакаў расцеш,
Забіраеш ім працу і званне.
Не сатруць слёз тваіх, калі плакаць пачнеш,
Плач не выкліча іх спачуванне.

А на старасць заные ў шчылінах душы
І туга, і забытыя страсці,
І ты ўбачыш тады, што ты жыў у глушы,
Як пустэльнік — без волі, без шчасця.

І прагоркне тады белы хлеб, як палын,
І хандра хмарай чорнай абніме.
Жыцця восень тваю, маладосці ўспамін
І апошнюю радасць адніме.

*1962 г.*

kamunikat.org

## НЕ СУМУЙ, БЕЛАРУС!

Не сумуй, беларус, што твой род
Не выходзіць з саслоўяў шляхецкіх,
Бо ўся шляхта твой родны народ
Апусціла для чынаў кадэцкіх.

Бо яна для зямных прывілей
Адраклася ад родных карэнняў,
Ад традыцыяў, свят, ад ідэй,
Ад малітваў свайго пакалення.

Адраклася ад мовы сваёй
I ад роднай і матчынай песні,
Пустазеллем расла пад мяжой
I загінула з часам ад плесні.

А твой род многа сотняў гадоў
Не зламалі хваробы, ні раны,
Бо відаць меў здаровую кроў,
Бо выходзіў з сялянскага стану.

А сяляне і ў буру, і ў град,
I ў галодныя годы нядолі,
Захавалі свой родны абрад,
I не здрадзілі мовы ніколі.

Захавалі малітвы дзядоў
I старынныя песні і байкі,
Біць паклон ля чужых алтароў
Іх не змусілі нават нагайкі.

Не прымусілі веры змяніць
Бзуіцкія пугі і школы,
Не маглі да сябе прыманіць
Таямнічыя муры касцёлаў.

А ў нядаўнія грозныя дні
Іх не знішчылі зграі фашыстаў,
І не выгналі з родных станіц
І мясцовыя банды нацыстаў.

І я веру далей, што твой род
Не паддасца націскам, ні модзе
Для кар'еры, каб жыць без турбот
Ён не здрадзіць крыніц асяроддзя.

Ён не здрадзіць малітваў сялян
І здалёк ад вясковай дубровы,
А калі ён пакіне іх стан
Не забудзе сваёй роднай мовы.

***1982 г.***



KAMUNIKAT.org

* * *

*Лідзіі Р.*

Біч насілля злучыў нас з сабою
На далёкай варожай зямлі,
На якую з турэмным канвоем
Пугі варвараў нас завялі.

Выгнаў вораг цябе з-пад Саколкі,
З роднай вёскі, ад родных бацькоў.
Ты прыйшла да мяне, як вясёлка
У час бурнай стыхіі марской.

Хоць не меў я з сабой ні капейкі,
Хоць не брыў я яшчэ барады,
Ты звязала са мной, чарадзейка,
Він пачуццяў сваіх маладых.

Ты адна асвяціла надзеяй
Змрок маіх вельмі жудасных дзён,
І паспела мне ў сэрцы пасеяць
Зёрны страсці і вырасціць плён.

Захапіў нас наркотык кахання
Чарам роскашы, сном забыцця,
І да самага дня расставання
Нас паіў эліксірам жыцця.

А апошнюю ноч пад скляпеннем
Мы чакалі пад трэскам грамоў,
Што світанне дасць нам вызваленне
І мы вернемся разам дамоў.

Ды яно нас зусім раздзяліла,
Разагнала па злой чужыне,
Горкі плач твой не меў нават сілы
Затрымаць там з табою мяне.

А ішлі мы дамоў з поўнай верай,
Што ўжо блізкі канец нашых мук,
Ды раптоўна ля снежнай алеі
Адабралі цябе з маіх рук.

Твой апошні, як жар, пацалунак
І слязамі арошаны твар, І
Твой ад'езд, невядомы кірунак
Паразілі мяне, як удар.

Я, як п'яны, ішоў па дарозе
Поўнай трупаў, разбітых вазоў,
І не думаў аб новай пагрозе
І аб тым, што спаткаю я зноў.

Хутка ў рукі дастаў я вінтоўку,
І салдацкага крою шынель,
І на фронт атрымаў я пуцёўку,
І ў акопах на снегу пасцель.

Я тужыў за табою ў траншэях
І ў шпіталі ў гарачцы ад ран,
І жыў толькі адною надзеяй:
Не самне нас ваенны таран.

Што мы хутка спаткаемся дзесьці.
Вернемся мы шчасліва дамоў,
Што ізноў я цябе буду песціць,
І ласкаць тваё цела, як шоўк.

Не збыліся мае летуценні,
Лёс мяне да цябе не прывёў,
Асталіся мне толькі, як цені,
Успаміны пра нашу любоў.

Слаў я пісьмы табе ў тваю вёску
І чакаў хоць на скромны адказ.
Я змяніў і мундзір, і прычоску —
Ад цябе не прыйшоў нават сказ.

Час залечыў парывы і раны
І гасіў да цябе страсць маю,
Ды яна ў моцным сэрца экране
Не здавалася доўга ў баі.

А прыгасла калі я ў вагоне
Пасля доўгай разлукі і мар,
Напаткаў цябе ў мужа палоне,
А твой сын побач бегаў, як шар.

Апусціла ты позірк прыгожы
І прызналася мужу свайму,
Што калісь мы ў няволі варожай
Не адну працярпелі зіму.

А твой муж усміхнуўся яхідна,
Паглядзеў на мяне, як удаў,
І на твары яго стала відна
Што ўжо нашы ўсе тайны ён знаў...

На зямлі той, куды калісь вораг
Выгнаў нас, налажыў кайданы,
Ты знайшла свой прытулак, апору
І дзіцё, як жывы след вайны.

Дзе цяпер ты? Ад гэтага часу
За табою прапалі сляды.
Толькі здымак твой з бляскам атласу
Захаваў я праз тыя гады.

***1981 г.***

# *Змест*

Адгмуль мы родам (уступ) ........................................3
Падляшша..............................................................5
Сланечніх..............................................................7
Лепш я хацеў бы .......................................................9
♦♦♦ Яро с у калысцы з палё ў і луго ў ......................10
Чаромха ў мінулым ..................................................11
Чырымуха..............................................................15
Радзіма ...............................................................18
Мая першая хата ....................................................20
Сустрэча...............................................................22
Ты ўжо забыла ......................................................25
Помню .................................................................28
Каб ты япгчэ ўчора прыйшла ......................................29
Хвіліна................................................................30
Хацеў бы я ...........................................................32
Што чуеце, дрэвы? ...................................................34
Вечар над ракой ....................................................35
Зноў Падляшша .....................................................38
Пасля дажджу ........................................................42
Успаміны .............................................................44
Ноч на пашы ..........................................................46
Дарога дамоў ........................................................48
♦♦♦ Сонца золатам праменняў .....................................50
Каханяс частародзіць горыч........................................51
♦♦♦ Разлухай з табой ............................................ 52
♦♦♦ Нашто ятабе, дарагая? ........................................ 53
♦♦♦ Ізноўяўроднайвесцы ......................................... 55
Магылькі ............................................................. 57
♦♦♦ Я зноў імкнуся да краіны........................................ 58
Фэст.................................................................... 60
Брату на чужыне ..................................................... 63
Не сумуй, беларус! ................................................... 65
♦♦♦ Біч насілля злучыў нас з сабою........................... 67